# Дзякуй табе за мір і спакой на нашай зямлі!



Я хачу расказаць пра свайго прадзядулю Дзяругу Мікалая Дзмітрыевіча.Ён нарадзіўся 9 мая 1914 года, а памёр у 1978 годзе.

Прадзядуля жыў і працаваў у вёсцы Грыцукі Вілейскага раёна. У 1939 годзе яго прызвалі ў польскае войска (бо гэта тэрыторыя на той час была ў складзе Польшчы).

Пачалася вайна. Прадзед Мікалай пайшоў на фронт. У час аднаго з баёў трапіў у нямецкі палон. Палонных немцы прадавалі як рабоў, і майго прадзядулю адправілі на работу па гаспадарцы да нямецкага баўэра. Толькі ў 1943 годзе прадзед змог вярнуцца дамоў (Беларусь у той час ужо была акупіравана немцамі). Мікалай Дзмітрыевіч папрасіўся ў немцаў-гаспадароў на “пабыўку” ў родныя мясціны. Гаспадары адпусцілі, бо ўсё роўна там жа былі “свае”.

Мужчына вярнуўся дадому восенню 1943 года. А ў 1944 годзе, калі Беларусь вызвалілі ад нямецкіх захопнікаў, быў прызваны ў Чырвоную армію.

У канцы 1944 года быў сур’ёзна паранены ў нагу. Пачалася гангрэна. Доўгі час знаходзіўся на лячэнні ў шпіталях на тэрыторыі Расіі. Урачы эвакуацыйнага шпіталя г. Чкалава прынялі рашэнне аб ампутацыі нагі. Прадзед Мікалай стаў інвалідам II групы, і ў пачатку 1945 года яго камісавалі па інваліднасці.

За баявыя заслугі  Мікалай Дзмітрыевіч узнагароджаны ордэнам Славы, медалём “За адвагу”.

Пасля вайны прадзядуля жыў і працаваў у роднай вёсцы, выхоўваў дачушак.

Мая бабуля часта расказвае, што прадзед Мікалай гаварыў, што ён шчаслівы чалавек, бо быў на вайне і застаўся жывы. А выжыў таму, што верыў у перамогу над фашызмам.

Ціхі вясенні вечар. Я сяджу ў засені квітнеючага саду, слухаю спевы птушак, любуюся зоркамі. Мне здаецца, што мой прадзядуля назірае за мной з нябеснай высі. Я ганаруся табой, Мікалай Дзмітрыевіч. Дзякуй табе за мір і спакой на нашай зямлі!

*Грыневіч Яўгенія*